На протяжении нескольких лет сотрудники собирали сведения о воинских захоронениях времен Великой Отечественной войны, расположенных на территории района. Работа велась специалистами отдела библиотечного маркетинга и библиографом ЦРБ. Активное участие также приняли сельские библиотекари. Каждый памятник был сфотографирован, восстановлены списки солдат. Вся собранная информация стала основой для реализации уникального проекта – создания историко-краеведческого сборника «Обелиски застыли сурово, охраняя погибших солдат». В него были включены фотоснимки памятников воинам и партизанам, их краткое описание и списки бойцов, погибших в годы Великой Отечественной войны при обороне и освобождении Сенненского района. Работа была завершена в 2012 году.

Спросом среди посетителей пользуются библиографические пособия патриотической направленности, такие, как «Подзвіг землякоў будзе жыць у вяках» (о Героях Советского Союза – уроженцах Сенненского района, 2009) и «Героі-вызваліцелі Сенненскага раёна» (2009). При подготовке указателей тщательно изучались литература, альбомы и папки газетно-журнальных статей. Была организована экскурсия к мемориальному комплексу «Куповать» и в музей боевой и трудовой славы Мошканского детского сада-средней школы им. А.К. Горовца, где экспонируются фотоматериалы и документы о П.М. Машерове и А.К. Горовце. Также было организовано посещение музея Студёнковского детского сада-средней школы, в котором собран материал о Герое Советского Союза М.А. Анискине.

Более двух лет сотрудники работали над созданием «Летописи библиотек Сенненского района» (2012), которая рассказывает об истории библиотечного дела в районе от дореволюционного времени по сегодняшний день. Презентация издания состоялась в районном Доме культуры на празднике, посвященном Году книги.

Прикоснуться к истории родного края поможет историко-краеведческий сборник «Адкуль у вёсцы імя» (2013) – своеобразная летопись с интересными сведениями об истории возникновения и происхождения названий деревень нашего района, также подготовленная специалистами ЦРБ.

Всегда интересны как местным жителям, так и гостям района «Легенды і паданні Сенненскага краю». Сборник создан на основе материала, собранного в ходе конкурса среди сельских библиотек «З крынічак памяці народнай» (2011). С целью популяризации литературно-поэтического наследия было издано «Паэтычнае сузор'е Сенненшчыны» (2008).

Ярким примером кропотливой краеведческой работы могут служить издания к знаменательным датам, которые представляют собой справочно-

познавательные материалы по истории и культуре родного края. Так, в библиотеке был издан краеведческий календарь «Мая Сенненшчына» (2013), в котором отражены важные даты из жизни Сенненского района.

Особое место в массиве издательской продукции библиотеки занимают библиографические пособия об известных людях края, их жизни и деятельности, литературном творчестве, которые позволяют полнее и целостнее представить уже имеющиеся в фонде материалы.

К юбилею нашего земляка, поэта, переводчика, кинодраматурга Анатолия Степановича Велюгина было подготовлено биобиблиографическое пособие «Паэт майго краю» (2013). В нем представлены краткая биография поэта, а также список основных произведений и литература о его жизни и творчестве.

«Слава і гонар зямлі беларускай» – так называется методико-библиографическое пособие, посвященное Петру Мироновичу Машерову (2013). В него вошли не только биографические и библиографические сведения об известном уроженце района, но и методические рекомендации и сценарные разработки по проведению социокультурных библиотечных мероприятий, посвященных памяти выдающегося политического деятеля.

Подготовлен и выпущен библиографический указатель «Знакамітыя землякі Сенненшчыны» (2012), посвященный людям, принесшим родному краю мировую известность (З.И. Азгур, П.М. Машеров, А.С. Велюгин и др.). Информация о наших современниках, которыми мы по праву можем гордиться, представлена в буклете «Гордимся земляками», подготовленном в текущем году.

В районе сильны спортивные традиции. Наши спортсмены достойно представляют «малую родину» на стадионах республики и мировых аренах. Информация о развитии спорта и спортсменах района нашла свое отражение в сборнике «Сенненщина спортивная» (2014).

Историко-патриотический сборник «Солдат войны не выбирает» (2014) посвящен воинам-интернационалистам района. Его презентация была приурочена к 25-летию вывода советских войск из Демократической Республики Афганистан.

Также в текущем году в рамках проведения в Беларуси Года гостеприимства библиотекарями был подготовлен и издан информационный буклет «Гостеприимная Сенненщина», рассказывающий о наиболее значимых достопримечательностях, местах отдыха и объектах агроэкотуризма Сенненского района. Текстовый материал буклета сопровождают фотографии описываемых объектов. Природе родного края посвящены буклеты «Сенненскія далягляды» и «Сенненскае возера». К 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков был создан буклет «Мінулых год святая памяць».

Издания Сенненской ЦРБ имеются в фондах всех сельских библиотек системы района, а наиболее востребованные краеведческие издания размещены на сайте Сенненской ЦБС (http://cbs-senno.by).

В настоящее время Сенненская центральная районная библиотека ведет работу по сбору и систематизации информации для создания сборника об участниках Великой Отечественной войны – уроженцах и жителях района «Война в судьбе моей семьи».

Интерес к истории родного края у читателей существует, и работники библиотеки стремятся его поддержать. Одна из главных задач, которую ставят перед собой библиотекари Сенненщины, – сохранить для потомков документальное наследие о культуре региона и помочь понять значение и роль своей «малой родины» в истории Беларуси.

***Маслякова Г.В.*** *(п. Друя, Браслаўскі раён)*

## ДРУЙСКІ БАРЫСАЎ КАМЕНЬ: З ГІСТОРЫІ АДКРЫЦЦЯ І ДАСЛЕДАВАННЯ

Друйская сельская бібліятэка Браслаўскай раённай сеткі публічных бібліятэк па праву можа лічыцца цэнтрам краязнаўчай работы ў сваёй мясцовасці. Пошукава-даследчая дзейнасць бібліятэкі вядзецца адразу па некалькіх напрамках. Адным з іх стаў збор і вывучэнне матэрыялаў пра Друйскі Барысаў камень – помнік эпіграфікі XII стагоддзя, які знаходзіцца на тэрыторыі населенага пункта.

У ходзе даследавання была праведзена работа з дакументнымі крыніцамі фондаў Віцебскай абласной і Браслаўскай цэнтральнай раённай бібліятэк, Браслаўскага раённага музейнага аб’яднання, вясковага архіва і інш. У выніку быў сабраны вялікі аб’ём інфармацыі, якая яшчэ будзе апрацавана і сістэматызавана, але ўжо зараз даследчыкі гатовы падзяліцца здабытымі матэрыяламі пра Барысавы камяні ўвогуле, і Друйскі ў прыватнасці.

Арэал гэтых унікальных помнікаў мінулага супадае з тэрыторыяй былога Полацкага княства – калыскі беларускай дзяржаўнасці. Барысавы камяні ўяўляюць сабой велізарныя валуны (да некалькі метраў) з выбітымі на іх крыжом і надпісамі кшталту «Господи помози рабу Своему Борису», дзе згадваецца імя Барыса, што дало падставу звязваць з’яўленне выяваў крыжоў і надпісаў на камянях з імем полацкага князя Барыса Усяславіча. Магчыма, да прыняцця хрысціянства гэтыя камяні былі паганскімі фетышамі.

Да нашага часу няма адназначнага меркавання аб мэце нанясення надпісаў на Барысавы камяні. Найбольш прывабнымі з’яўляюцца версіі аб камянях як межавых знаках і аб надпісах-маленнях у галодны 1128 год. Пры ўсёй спрэчнасці гэтых версій магчыма зрабіць дакладныя высновы аб спробе пераўтварэння язычніцкіх святыняў у хрысціянскія, а таксама аб існаванні княжацкай адміністрацыі, наяўнасць якой дазволіла ажыццявіць сінхроннае нанясенне надпісаў.

Барысавы камяні былі выяўлены і апісаны да канца XIX ст. Сярод шматлікіх прац гэтага перыяду варта вылучыць кнігу вядомага гісторыка, археографа А.П. Сапунова «Двинские, или Борисовы, камни» (Віцебск,

1890). Манаграфія змяшчае падрабязныя апісанні помнікаў даўніны, якасны ілюстрацыйны матэрыял, асабліва каштоўны цяпер, у сувязі з тым, што значная частка Барысавых камянёў аказалася знішчанай. Пасля А.П. Сапунова ў працах даследчыкаў пераважалі спробы асэнсаваць прызначэнне валуноў і надпісы на іх. Грунтоўны агляд найважнейшых публікацый па дадзенай тэматыцы зрабіла беларускі археолаг Л.У. Дучыц.

Колькі існавала Барысавых камянёў, невядома. У літаратуры захаваліся звесткі пра сем, пяць з якіх знаходзіліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. Большая частка Барысавых камянёў была знішчана ў ХХ ст. у перыяд актыўнай барацьбы з рэлігіяй, або перавезена. Да нашых дзён захаваліся адзінкі. Друйскі Барысаў камень – па ліку восьмы і адзін з нямногіх ацалелых, які да таго ж ляжыць практычна на сваім гістарычным месцы: ён быў знойдзены ў сутоцы рэк Дзвіны і Друйкі. На камені бурага колеру – выява шасціканцовага крыжа з пашыранымі канцамі і надпіс: ІС ХС НИ КА ГИПОМОЗИ РАБОУ (С)ВОЕМУ («Ісус Хрыстос Ніка. Госпадзе дапамажы рабу Свайму... »). Тэкст датуецца ХІІ стагоддзем.

Адкрылі яго апошнім сярод Барысавых камянёў. Зрабіў гэта ў сярэдзіне 1890-х гадоў А.П. Сапуноў – ужо пасля выхаду манаграфіі, прысвечанай Барысавым камяням. Вось чаму некаторыя пазнейшыя даследчыкі не ўлічвалі Друйскі пісанік у сваіх працах. Апісанне і якасную замалёўку помніка А.П. Сапуноў змясціў у выданні, падрыхтаваным сумесна з Друцкім-Любецкім, – «Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии» (Віцебск, 1896). Дарэчы, для гісторыка было дзіўным, проста невытлумачальным, чаму помнік не быў адкрыты раней і чаму ён малавядомы сярод мясцовых жыхароў. Друя ў канцы ХІХ ст. лічылася горадам, налічвала каля 6 тыс. чал. насельніцтва. Паселішча мела багатую гісторыю, адметную гістарычна-архітэктурную спадчыну. З пачатку XVII ст. горад карыстаўся магдэбургскім правам, быў буйным рамесным і гандлёвым цэнтрам Падзвіння. У XVIII ст. тут дзейнічала каля 20 храмаў, тры манастыры. Відавочна, што ў горадзе была праслойка адукаваных людзей. Тым не менш, калі ў 1864 годзе Друю наведаў мастак і археолаг Д.М. Струкаў, які выяўляў помнікі даўніны, пра камень яму не паведамілі. Д.М. Струкаў пакінуў 16 замалёвак вартых увагі помнікаў і мясцін у Друі, дзённікавыя запісы, але ў іх звесткі пра валун адсутнічаюць. У раздзеле кнігі А.П. Сапунова, прысвечаным Друі, даследчык піша: «… В Друе на самом берегу Двины, саженях в 50 ниже впадения в нее реки Друйки насупротив Спасской церкви находится Борисов камень. Замечательно, что о кресте с надписью на этом камне до сих пор решительно никто не знает даже в самой Друе, правда и мне удалось разобрать только часть надписи. Камень, красноватый валун в окружности более 11 аршин, нижняя часть его отколота, весной и осенью камень совершенно покрывается водой…».

Звернем увагу на такую акалічнасць. Старажылы, якія яшчэ памятаюць першую трэць ХХ стагоддзя, згадваюць, што камень, які ўсе называлі Спасаўскім, Спаскі, Спаса, ляжаў амаль насупраць драўлянай Спасаўскай

царквы, што ўзвышалася на краі стромкага схілу да ракі Друйкі. Аказалася, жыхары Друі называлі камень Спасаўскім і звязвалі крыж з надпісам гэтага храма, што засведчылі старыя жыхары мястэчка напрыканцы ХХ ст. Цемнавата-буры валун добра награваўся пад сонцам. Дарэчы, жыхары Друі кажуць, што цёплай паверхня каменя заставалася і калі ён ляжаў у вадзе, якой бы халоднай тая ні была.

Пасля А.П. Сапунова Друйскім каменем ніхто спецыяльна не цікавіўся, хаця даследчык адзначыў, што поўны тэкст яму прачытаць не ўдалося. У 1920-я гг. была зроблена фотафіксацыя помніка. У гэты час помнікі друйскай даўніны даследавала група польскіх навукоўцаў, у складзе якой знаходзіўся знакаміты фатограф Ян Булгак. Здымак Булгака, выдатны па якасці, не быў, аднак, прыдатны для далейшага вывучэння надпісу.

Калі Друйскім Барысавым каменем пасля доўгага перапынку зацікавіліся даследчыкі, валуна не аказалася на месцы, апісаным у працах. Л.У. Дучыц, якая на працягу 1970–1990-х гадоў даследавала шэраг археалагічных помнікаў Браслаўшчыны, першай сярод даследчыкаў звярнула ўвагу на тое, што гэты камень не быў знішчаны ў выніку гаспадарчай дзейнасці і што ёсць надзея яго адшукаць. Папярэднія даследаванні дазволілі вызначыць прычыну знікнення валуна.

Камлыга даволі значных памераў знаходзілася ля берага ракі Друйкі ў самых сутоках яе з Дзвіной. Пры звычайным узроўні вады на паверхні быў бачны ладны кавалак каменя з крыжам і надпісам. Напрыканцы 1930-х гадоў на р. Друйцы ў межах паселішча ўтварыўся вялізны ледзяны затор, які пагражаў чыгуначнаму і дарожнаму мастам. Затор ліквідавалі з дапамогай выбухаў. У выніку месіва з лёду і вады панеслася ў бок Дзвіны. Барысаў камень, які перажыў да таго сотні паводкаў і крыгаходаў, не ўстаяў – крыгі перакулілі камлыгу, зацягнулі яе ў больш глыбокае месца рэчышча, дзе валун паступова занесла пяском. Стала знікаць і памяць пра камень. Прынамсі, сярод мясцовых жыхароў ён не шанаваўся, крыжу і надпісу не надавалі асаблівага значэння. З гэтай прычыны Друйскі камень, які знаходзіўся не ў якім аддаленым урочышчы, а ў межах значнага паселішча, доўгі час не быў вядомы даследчыкам.

У 1982–1984 гадах працамі па выяўленні і лакалізацыі валуна з надпісам кіравала Л.У. Дучыц. У пошуках удзельнічалі аквалангісты-аматары. Пад вадой прасочвалася вялікая камлыга, большая частка якой была занесена пяском. Даследавалі кожны квадратны сантыметр даступнай паверхні, аднак рукатворных знакаў выявіць не ўдалося, толькі добра выяўляліся глыбокія драпіны і расколы прыроднага паходжання. Вызваліць камень ад наносаў і перамясціць на бераг экспедыцыя так і не змагла. Працы аднавіліся ў другой палове 1980-х гадоў у сувязі з планамі ўзвядзення плаціны Даўгаўпілскай ГЭС. Чакалася, што ў раёне Друі ўзровень вады ў Дзвіне падымецца на некалькі метраў, а ў такім разе помнік мог быць страчаны назаўсёды. Працы праводзіліся па ініцыятыве створанага ў Браславе музея. Прапановы музея знайшлі падтрымку з боку

раённых улад. Працы праводзіліся некалькі летніх сезонаў. Аднак яны ўскладняліся высокім узроўнем вады. Хуткаплынная рака змяняла характар дна і часам аквалангісты гублялі ранейшыя арыенціры. Друйская таямніца засталася ў спакоі яшчэ амаль на 15 гадоў.

Правядзенню прац па выяўленні і перамяшчэнні Друйскага Барысавага каменя садзейнічала сухое лета 2002 года. Узровень вады ў р. Дзвіна ўпаў настолькі, што раку каля мястэчка можна было пераходзіць уброд, р. Друйка наогул сільна абмялела. Фрагмент валуна чырванаватага колеру выглянуў на паверхню. Пачаліся працы па перамяшчэнні валуна на бераг. Для гэтага выкарыстоўвалася меліяратыўная тэхніка. Справа аказалася не такой простай. Толькі 23 кастрычніка камлыгу, вагу якой спецыялісты ацэньвалі ў 20–30 тон, удалося ўстанавіць на высокім беразе Друйкі, у той частцы паселішча, якая называецца Вусцем. У ходзе прац валун разваліўся на тры кавалкі па трэшчынах, якія былі зафіксаваны яшчэ аквалангістамі экспедыцыі Л.У. Дучыц. Крыж і надпіс знаходзяцца на самым вялікім кавалку, пашкоджанай аказалася верхняя частка крыжа.

Выяўленне Друйскага Барысавага каменя даволі шырока асвятлялася ў прэсе. Аднак помнік, па сутнасці адкрыты наноў, не прыцягнуў увагі даследчыкаў. Між тым, былі падставы сцвярджаць, што Друйскі пісанік можа аказацца адным з найбольш цікавых Барысавых камянёў, таму што яшчэ А.П. Сапуноў адзначыў, што апрача звычайнай формулы з упамінаннем імя Барыса на паверхні валуна выяўляюцца рэшткі іншага тэксту, моцна пашкоджанага выветрываннем. А.П. Сапуноў здолеў разабраць тут усяго чатыры літары, якія пазначыў на замалёўцы. Астатнія літары паспрабавалі прачытаць краязнаўцы Друйскай школы пад кіраўніцтвам настаўніка М. Ставіцкага. Даследаванні праводзіліся метадычна ў розныя поры года, з прыцягненнем дапаможных сродкаў. Напрыклад, у паглыбленні насыпаўся пясок, заціраўся снег, у летнюю спёку камень абліваўся вадой. Этапы працы фіксаваліся на лічбавую камеру, здымкі апрацоўваліся на камп’ютары. Але найбольшы эфект даў наступны спосаб. На паверхню валуна з літарамі быў пакладзены аркуш тэхнічнай фольгі, які стаў апрацоўвацца гумовым малатком. На фользе адбіліся ўсе дэталі валуна. З такім злепкам можна было працаваць у памяшканні, ужываючы фарбавальнікі, змяняючы вуглы крыніц асвятлення. Усё гэта дазваляла выяўляць літары, якія цяжка заўважаліся на самім валуне. У сувязі з тым, што валун моцна пашкоджаны выветрываннем, значная частка літар расшыфроўваецца нялёгка.

У 2011 годзе да 625-годдзя гарпасёлка Друя Барысаў камень быў перамешчаны з вусця ракі Друйкі на цэнтральную плошчу населенага пункта на ўсеагульны агляд. Рэліквія ўсталявана недалёка ад яе гістарычнага месца знаходжання, размешчана крыжом уверх. Цікавасць да валуна з надпісам ёсць як у мясцовых жыхароў, так і ў турыстаў, што прыязджаюць у Друю. Такім чынам, узрастае запатрабаванасць інфармацыі пра гэты гістарычны помнік. Спецыялісты Друйскай сельскай бібліятэкі

Браслаўскай раённай сеткі публічных бібліятэк спадзяюцца, што сабраныя імі матэрыялы ў пэўнай ступені змогуць яе задаволіць.

**Літаратура:**


1. Дучыц, Л. Барысавы камяні: (гістарыяграфічны агляд) / Л. Дучыц // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1985. – № 4. – С. 69–73.
2. Шыдлоўскі, К. Друйскі Барысаў камень. З гісторыі адкрыцця і даследавання / К. Шыдлоўскі // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навук.-краязн. канферэнцыі / Браслаўскае музейнае аб’яднанне. – Браслаў, 2003. – С. 109–111.



***Тутава Г.І., Іванова В.А.*** *(г. Гарадок)*


## ПОШУКАВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ХАЛАМЕРСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Вёска Халамер’е знаходзіцца ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці амаль на мяжы з Расійскай Федэрацыяй, насельніцтва – 270 чалавек. Вёска славіцца сваімі песнямі, абрадамі, звязанымі з асноўнымі вехамі жыцця чалавека.

Таццяна Іванаўна Раева, бібліятэкар мясцовай бібліятэкі, па адукацыі клубны работнік, кіраўнік народнага калектыву, але за 18 гадоў працы ў бібліятэцы яна паказала, што бібліятэчная работа займае галоўнае месца ў яе жыцці. Асаблівую ўвагу Таццяна Іванаўна надае пошукавай дзейнасці як крыніцы фарміравання новых краязнаўчых рэсурсаў.

З 2005 года Халамерская сельская бібліятэка працуе па мэтавай праграме «Спадчына», адна з задач якой – адраджэнне звычаяў і абрадаў Халамершчыны. У рамках праграмы на працягу апошніх сямі гадоў бібліятэка разам з удзельнікамі дзіцячага фальклорнага клуба «Вечарынка», які працуе пры бібліятэцы, арганізоўвала этнаграфічныя экспедыцыі. У выніку быў сабраны вялікі фальклорны матэрыял, у першую чаргу народныя спевы.

Для таго каб сфарміраваць краязнаўчыя рэсурсы, бібліятэкар Халамерскай бібліятэкі заўжды знаходзіцца ў пошуку. Даследчую работу яна распачала яшчэ ў далёкія 1990-я гады, калі задумала аднавіць абрад «Вяселле ў Халамер’і». Рэдкія, пэўныя факты аб ім засталіся ў памяці сталых жыхарак Халамершчыны: Таццяны Трафімаўны Бараўцовай, Ірыны Раманаўны Філімонавай, Зінаіды Кузьмінічны Нікалаевай і інш. Яны і сталі асноўнымі кансультантамі пастаноўкі гэтага абрада. Кніга Уладзіміра Сысова «З крыніц спрадвечных», які ў свой час таксама наведаў вёску, стала добрай падтрымкай у рабоце. Танцы дапамог паставіць Іван Серыкаў, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Пастаноўка абрада прадстаўляе эпізод развітання нявесты з маці, збор і ад’езд да маладога, першы дзень вяселля. З гэтым абрадам мясцовыя артысты былі запрошаны на абласное тэлебачанне, дзе інсцэніроўка была прадстаўлена ў цыкле тэматычных праграм. Пад кіраўніцтвам бібліятэкара яна была паказана неаднаразова.

Матэрыял афармлены ў папках «Вяселейка нам Бог даў» і «Вясельныя песні Халамерскага краю». На абрадавыя песні «Ай, Ванечка-паночак», «Свіснуў селязень на лугу» Т.І. Раева напісала ноты, якія таксама змешчаны ў гэтых папках і своеасабліва дапаўняюць бібліятэчныя краязнаўчыя рэсурсы.

У 2006 годзе пошукавая дзейнасць прайшла ў рамках першай этнаграфічнай экспедыцыі «Ад родных ніў». Яе задачай стаў збор прыпевак і прыказак в. Маісеева.

Да 65-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бібліятэка правяла этнаграфічную экспедыцыю «Песні юнацтва нашых бацькоў». Большасць матэрыялаў прадставіў жыхар вёскі Маісеева Мікалай Іванавіч Раеў (1930 г. н.). Песні, якія спявалі аднавяскоўцы пасля вайны, ён напеў, а бібліятэкар іх запісала і з дапамогай спецыялістаў аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі выпусціла зборнік «Песни юности наших отцов», у які ўвайшлі песні «Среди просторов Беларуси», «Товарищ, сядь-ка со мной рядом», «Над озером чаечка вьётся» і інш.

У рамках чацвёртай этнаграфічнай экспедыцыі «Ад родных ніў» бібліятэкарам Т.І. Раевай былі запісаны песні са слоў Валянціны Нічыпараўны Чакулаевай (в. Маісеева). На аснове запісаў быў падрыхтаваны зборнік «Я голасам душы і сэрца Радзіме песню прапяю».

2012 год стаў адметным зборам новых фальклорных матэрыялаў: багаты мясцовы песенны рэпертуар прадставіла Роза Афанасьеўна Хішова (в. Обаль). Песні, якія яна напела, бібліятэкар запісала на магнітную стужку і зараз выкарыстоўвае ў рабоце клуба «Вечарынка». Пазаабрадавыя песні «Кацісь яблачка», «Ой да ты, калінушка» выкарыстоўваюцца ў рэпертуары ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці.

У 2013 годзе прайшла шостая этнаграфічная экспедыцыя «Ад родных ніў», па выніках якой удзельнікі клуба «Вечарынка» паставілі абрад «Здыманне вянка ў маладой» (у хаце жаніха). Для таго каб паставіць гэты абрад, бібліятэкар наведала жыхарак навакольных вёсак. У вёсцы Халамер'е – Паліну Сямёнаўну Дзям'янаву (1918 г. н.), у вёсцы Пляханава – Ірыну Раманаўну Філімонаву (1929 г. н.), у вёсцы Обаль – Надзею Іванаўну Шакуцёву. Гэтыя жанчыны не толькі сталі кансультантамі пастаноўкі абрада, але і актыўнымі яго ўдзельніцамі. У іх выкананні прагучалі песні «А ў нашага свата, а ў нашага свата», «Круцяць, вяжуць хахлушку». Сумесна з маладымі ўдзельнікамі інсцэніроўкі праспявалі песні «Лятаў галубец па стале», «Накоснічак петушок» і інш. Былі паказаны танцы, выкананыя на мясцовы манер: «Кракавяк», «Полька», «Барыня». Іх пастаноўкі адбыліся з дапамогай мясцовых жыхарак Надзеі Іванаўны Ахрамеевай (в. Маісеева) і Мальвіны Іванаўны Александровай (в. Обаль). Зараз вядзецца работа па складанні харэаграфічнага малюнка танцаў для папаўнення краязнаўчага фонду бібліятэкі. Увесь матэрыял сабраны ў тэматычную папку «Здыманне вянка ў маладой: халамерскі вясельны абрад» і займае пачэснае месца ў краязнаўчым кутку бібліятэкі.

Халамершчына – гняздоўе не толькі аматараў вуснай народнай творчасці, але і цудоўных умельцаў – майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Адным з іх быў Віктар Філімонавіч Цяцёркін (1924–2002 гг.) – мастак і разьбяр па дрэве, майстра інсітнага мастацтва. Яго талент быў добра вядомы аматарам народнай культуры Гарадоччыны. Работы майстра з дрэва «Калодзеж "журавель"», «Арол», «Дзяцел», «Орлік», «Зімовы вершнік» неаднаразова прымалі ўдзел у шматлікіх раённых і абласных выставах, святах народнай творчасці і ў чатырох нацыянальных выставах мастацтва insita (1994 г., 2000 г., 2008 г., 2012 г.).

Пачынаў ён творчую дзейнасць з вырабу дзіцячай цацкі, упрыгожанай роспісам. Затым прыступіў да стварэння кампазіцый па казачных сюжэтах і на тэму вясковага жыцця. Яшчэ пры жыцці мастака бібліятэкар Т.І. Раева цікавілася яго творчасцю, а пасля яго смерці распачала пошукавую работу па выяўленні твораў мастака. З гэтай мэтай у рамках этнаграфічнай экспедыцыі «Ад родных ніў» бібліятэкар наведала аднавяскоўцаў. У выніку праведзенай работы ў Халамерскай сельскай бібліятэцы была афармлена пастаянная выстава вырабаў народнага майстра, якая дакладна прадстаўляе наведвальнікам рэдкі від краязнаўчага рэсурсу Гарадоччыны – інсітнае мастацтва і разьбу па дрэве. У экспазіцыю ўвайшлі карціны майстра з краявідамі роднай прыроды, карціны-паштоўкі, фігуркі жывёл, выразаныя з дрэва, макет царквы і інш.

Яго творы захоўваюцца таксама ў гарадоцкім Доме рамёстваў і фальклору, Гарадоцкім краязнаўчым музеі, Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці.

У бягучым годзе з мэтай фарміравання новых краязнаўчых рэсурсаў бібліятэка распрацавала і рэалізуе праект «Таямніцы народнай культуры». Яго задача – папулярызацыя ведаў аб мясцовым фальклоры і абраднасці. У рамках праекта клуб «Вечарынка» плануе правесці сёмую этнаграфічную экспедыцыю «Ад родных ніў» для пошуку новых краязнаўчых крыніц, а па яе выніках арганізаваць выставу-кірмаш твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ужо зараз вядзецца работа па зборы матэрыялу для зборніка «Носьбіты традыцыйнай культуры Халамерскага краю», прысвечанага народным умельцам.

Бібліятэкар Халамерскай сельскай бібліятэкі Т.І. Раева звязвае пошукава-даследчую дзейнасць бібліятэкі з практычнымі задачамі фарміравання краязнаўчых рэсурсаў і абслугоўвання чытачоў. Адну з асноўных сваіх задач Таццяна Іванаўна вызначае як папаўненне краязнаўчых рэсурсаў бібліятэкі, раскрыццё іх складу і ўдакладненне назапашаных краязнаўчых ведаў.

**Літаратура:**

1. Мастацтва insita : з гісторыі правядзення выставак непрафесійнага мастацтва / уклад. Л.У. Вакар. – Мн.: СтройМедиаПроект, 2013. – 304 с.: іл.
2. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мн.: Выш. школа, 1997. – 415 с.

***Карновіч М.А.*** *(в. Курына, Віцебскі раён)*

# ПОШУКАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ НОВЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ РЭСУРСАЎ КУРЫНСКАЙ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

З 2009 года Курынская сельская бібліятэка Віцебскай раённай сеткі публічных бібліятэк працуе згодна з мэтавай праграмай «Тут карані, адсюль вытокі», якая прадугледжвае папулярызацыю краязнаўчых ведаў і садзейнічае адраджэнню і захаванню гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна. За гэты час бібліятэкай быў назапашаны грунтоўны матэрыял па гісторыі і культуры роднага краю, створаны этнаграфічны куток пры бібліятэцы, арганізавана аматарскае аб’яднанне «Уцеха», якое адраджае старадаўнія промыслы саломапляцення і бяростапляцення. З 2012 года бібліятэка выйшла на новы этап работы па адраджэнні мастацкіх народных рамёстваў і садзейнічанні развіццю сельскага агратурызму.

Пошукава-даследчая дзейнасць бібліятэкі ў галіне краязнаўства мае сваю спецыфіку. Факты, на якія скіравана даследча-пазнавальная працэдура, часцей за ўсё прадстаўлены ў выглядзе дакументных крыніц інфармацыі. Таму пры рабоце над краязнаўчымі і бібліяграфічнымі матэрыяламі прымяняюцца кнігазнаўчыя і бібліяграфічныя метады пазнання дакументаў.

Набытыя краязнаўчыя веды ўвасабляюцца ў створаных калекцыях краязнаўчых і мясцовых дакументаў, краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсах.

Умоўна краязнаўчыя рэсурсы Курынскай сельскай бібліятэкі можна падзяліць на некалькі блокаў:

– літаратура (мастацкая, навуковая, публіцыстычная, даведачна-бібліяграфічная) з фонду бібліятэкі, якая змяшчае краязнаўчую інфармацыю пра дадзены рэгіён;

– перыядычныя выданні з краязнаўчымі матэрыяламі пра вёскі Курынскага сельскага Савета і іх жыхароў;

– матэрыялы, створаныя ў ходзе пошукава-даследчай работы (летапіс вёскі, летапіс бібліятэкі, краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі, навуковыя справаздачы па выніках даследаванняў, тэматычныя папкі па гісторыі і культуры роднага краю і інш.);

– краязнаўчая інфармацыя на электронных носьбітах;

– экспанаты этнаграфічнага кутка;

– вырабы аматарскага аб’яднання «Уцеха», якія прадстаўляюць рамёствы, што былі распаўсюджаны сярод мясцовага насельніцтва ў старадаўнія часы.

У краязнаўчым фондзе Курынскай сельскай бібліятэкі знаходзяцца як распаўсюджаныя выданні, так і даволі рэдкія, напрыклад, брашура К. Крапівы «Герой Савецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі» (1943 г.). Краязнаўчы фонд выдзелены і размешчаны ў бібліятэцы на асобным стэлажы.

Важным дапаўненнем да краязнаўчага фонду з’яўляюцца альбомы, тэматычныя папкі артыкулаў «Справы і людзі нашай вёскі на старонках друку».

Курынская бібліятэка працуе не толькі з краязнаўчымі матэрыяламі, што паступаюць у фонд бібліятэкі ў выніку камплектавання, але і вядзе самастойны пошук, праводзіць даследаванні, якія даюць магчымасць набыць або стварыць новыя краязнаўчыя рэсурсы. Вынікам такой работы стала напісанне летапісу вёскі Курына. На яго старонках прадстаўлены запісы сустрэч з вясковымі старажыламі, іх успаміны, фотадакументы, копіі матэрыялаў з дзяржаўных і сямейных архіваў, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, фондаў Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Матэрыялы, прадстаўленыя ў летапісе, кожны год дапаўняюцца і ўдакладняюцца, а потым выкарыстоўваюцца падчас падрыхтоўкі і правядзення сацыякультурных мерапрыемстваў у бібліятэцы.

Адной з самых трагічных і насычаных на падзеі старонак гісторыі нашай краіны сталі гады Вялікай Айчыннай вайны. Курынская зямля не толькі шмат перанесла ў гэты час, але і змагла гераічна супрацьстаяць ворагу. Менавіта гэты перыяд у гісторыі краю выклікае асаблівую цікавасць у бібліятэкараў-краязнаўцаў. Так, былі праведзены даследчыя і пошукавыя работы па тэмах «Малалетнія вязні вёскі Курына» і «Страчаныя вёскі на тэрыторыі Курынскага сельскага Савета», распрацаваны турыстычны маршрут «Па партызанскіх мясцінах Курынскай зямлі».

З мэтай папулярызацыі культурнай спадчыны сваёй мясцовасці бібліятэкай выдадзены краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік «Родны край, ты мне мілы спрадвеку: што чытаць пра Курынскі край». Матэрыялы ў паказальніку размешчаны па наступных раздзелах: «Зямля, нам дадзеная лёсам» (гісторыя в. Курына з часоў першага ўпамінання ў летапісных дакументах да нашых дзён), «Курынскі край у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Героі – нашы землякі», «Матэрыяльная і духоўная спадчына Курынскага краю». Паказальнік ілюстраваны, змяшчае шэраг фотаздымкаў.

Дакументы па гісторыі вёскі, у тым ліку фотаматэрыялы, таксама становяцца аб’ектамі краязнаўчых даследаванняў бібліятэкі. Так з’явілася творчая краязнаўчая работа «З гісторыі аднаго фотаздымка», якая распавядае пра гісторыю царквы Святога Мікалая Цудатворца (1824 г.), што калісьці ўпрыгожвала цэнтральную вуліцу вёскі Курына, а зараз вядзецца яе рэканструкцыя.

Гісторыя населенага пункта яскрава прасочваецца праз прадметы побыту яго жыхароў. Пошукавыя экспедыцыі па ваколіцах Курыншчыны далі магчымасць сабраць разнастайныя этнаграфічныя экспанаты і стварыць этнаграфічны куток пры бібліятэцы. Некаторыя з гэтых экспанатаў сталі аб’ектамі больш дэталёвага даследавання. Так, напрыклад, пры вывучэнні калекцыі ручнікоў этнаграфічнага кутка бібліятэкі ў 2011 годзе быў падрыхтаваны навуковы даклад «Семантыка арнаменту ручнікоў вёскі Курына», які быў асабліва вылучаны на раённай навукова-практычнай

канферэнцыі «Пошук нараджае адкрыццё», арганізаванай аддзелам адукацыі Віцебскага райвыканкама.

Нельга абысціся без даследчай дзейнасці пры ажыццяўленні краязнаўчых праектаў. Так, пры рэалізацыі літаратурна-этнаграфічнага праекта «Свая хатка як родная матка» ў рамках праграмы «Тут карані, адсюль вытокі» было праведзена даследаванне «Мая сядзіба», якое вызначыла этапы пабудовы сялянскіх хат, тыпы пабудоў, а таксама звычаі і абрады, якія былі звязаны з гэтым працэсам. Пошук інфармацыі ажыццяўляўся на аснове мясцовага матэрыялу.

Час патрабуе новых падыходаў да зберажэння і падачы інфармацыі, таму ў Курынскай сельскай бібліятэцы робяцца спробы па яе захаванні ў электронным варыянце і прапануюцца новыя формы яе выкарыстання. Так, да 70-годдзя вызвалення Курынскай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў зманціраваны відэаролік «Гарэў мой край у полымі вайны», да конкурсу юных экскурсаводаў сумесна з ДУА «Курынскі дзіцячы сад-базавая школа Віцебскага раёна» зроблена электронная прэзентацыя «Мая малая Радзіма», якая стала своеасаблівай візуалізацыяй «Летапісу вёскі Курына». Таксама бібліятэка распрацавала краязнаўчы электронны праект «Ад вытокаў – да вечнага».

Дзейнасць па назапашванні дакументаў пра гістарычнае мінулае вёскі Курына прывяла ў свой час да высновы аб неабходнасці стварэння пры бібліятэцы этнаграфічнага кутка. Этнаграфічныя экспедыцыі па вёсцы Курына і яе ваколіцах далі магчымасць сабраць даволі багатую этнаграфічную калекцыю, вельмі разнастайную па змесце: рэчы гаспадарчага і хатняга ўжытку, адзенне, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – даматканыя посцілкі, вырабы, вязаныя кручком, пруткамі, вышытыя сурвэткі, ручнікі і г.д. Усе экспанаты падпісаны з указаннем назвы прадмета і яго ўладальніка (калі гаспадар вядомы). На сённяшні дзень этнаграфічны куток налічвае 124 экспанаты.

Асобае месца ў дзейнасці бібліятэкі займае работа аматарскага аб’яднання «Уцеха», удзельнікі якога асвойваюць народныя рамёствы: саломапляценне, бяростапляценне, лозапляценне. Усе гэтыя віды народных промыслаў мелі месца ў дзейнасці нашых аднавяскоўцаў, таму асноўная задача аматарскага аб’яднання адрадзіць старадаўнія віды рамёстваў, якія з’яўляюцца носьбітамі духоўнага і матэрыяльнага светапогляду нашых продкаў. Інфармацыйным рэсурсам у дадзеным выпадку з’яўляецца сам выраб (берасцяны, саламяны), зроблены па ўзорах, знойдзеных у спецыялізаванай літаратуры або пераняты ў выніку перадачы вопыту ад майстра да вучня.

Пошукавая дзейнасць бібліятэкі мае на мэце не толькі выявіць крыніцы інфармацыі, але і перадаць гэты досвед наступным пакаленням. У краязнаўчай рабоце вельмі важным з’яўляецца не толькі збіранне інфармацыі ці рэчаў, але і іх сістэматызацыя, аналіз, выяўленне агульных і спецыфічных асаблівасцяў. Адсюль мы выходзім на разуменне таго, у чым унікальнасць дадзенай мясцовасці, гэтым тлумачацца яе спецыфіка і непаўторнасць.

# ЗВЕСТКІ АБ АЎТАРАХ

АНЕГДЗІНА Марына Віктараўна, загадчык аддзела камплектавання фонду і апрацоўкі дакументаў ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

ГАРЛАЧОВА Алена Мікалаеўна, бібліёграф першай катэгорыі сектара замежнай літаратуры ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

ДОГІЛЬ Кацярына Віктараўна, метадыст першай катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

ДУДАРАВА Надзея Аляксандраўна, бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Дубровенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

ІВАНОВА Вольга Аляксандраўна, намеснік дырэктара Гарадоцкай раённай сеткі публічных бібліятэк

КАЖЭРАВА Аксана Сяргееўна, бібліёграф першай катэгорыі Лёзненскай раённай сеткі публічных бібліятэк

КАЛУЖОНАК Надзея Уладзіміраўна, галоўны бібліёграф інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела Полацкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны

КАПОЙКА Аксана Аляксандраўна, метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бешанковіцкай раённай сеткі публічных бібліятэк

КАРНОВІЧ Марыя Аляксандраўна, бібліятэкар другой катэгорыі Курынскай сельскай бібліятэкі Віцебскай раённай сеткі публічных бібліятэк

КАСТУНОВА Надзея Іванаўна, вядучы бібліёграф аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

ЛЮБЧАНКА Вольга Анатольеўна, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, суіскальнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

МАЗГО Алена Віктараўна, намеснік дырэктара Лепельскай раённай сеткі публічных бібліятэк

МАСЛЯКОВА Ганна Васільеўна, бібліятэкар Друйскай сельскай бібліятэкі Браслаўскай раённай сеткі публічных бібліятэк

ПАШКЕВІЧ Наталля Пятроўна, бібліятэкар другой катэгорыі бібліятэкі Віцебскага дзяржаўнага імя ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта

ТУТАВА Галіна Іванаўна, метадыст першай катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу Гарадоцкай раённай сеткі публічных бібліятэк

ШЫМАН Вольга Уладзіміраўна, бібліятэкар другой катэгорыі Навуковай бібліятэкі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава

ЯСКЕВІЧ Кацярына Дзмітрыеўна, вядучы бібліёграф аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

Навуковае выданне

# ПОШУКАВАЯ І ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

Матэрыялы абласных навуковых чытанняў маладых бібліятэкараў

г. Віцебск, 29 кастрычніка 2014 г.

Складальнік **НЯВЕЙКАВА** Вольга Макараўна

Адказны за выпуск *А.І. Сёмкін*
Афармленне вокладкі *К.В. Стральцовай*
Карэктар *А.М. Фенчанка*

Падпісана ў друк 01.10.2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,49. Ул.-выд. друк. арк. 3,88. Тыраж 57 экз. Заказ .

Паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”.
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.